ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

'91

ЧАЦВЕР 25 КРАСАВІКА

№ 11(1675)

ЧЫРВОНЫ РАДОК

З пачатку красавіка пачало сваё існаванне малое культурна-камерцыйнае прадпрыемства «Міжнародная школа беларусістыкі». Яно будзе займацца навучаннем замежных і савецкіх вучоных-славістаў, садзейнічаць выкананню Дзяржаўнай праграмы развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Беларусі, узняцію прэстыжу беларускай мовы ў міжнародным маштабе, аказваць канкрэтную практычную дапамогу славістам з розных краін у авалоданні беларускай мовай, рыхтаваць перакладчыкаў з беларускай на іншыя мовы народаў свету, прапагандаваць дасягненні духоўнай культуры беларускага народа за мяжой. Дырэктарам новага падраздзялення стаў загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры для прыродазнаўчых факультэтаў У. А. НАВУМОВІЧ.

* * *

17—18 красавіка ва універсітэце прайшла навукова-метадычная канферэнцыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў, прысвечаная 70-годдзю БДУ, «Навукова-метадычныя праблемы выкладання ў ВНУ». На пленарным пасяджэнні выступілі рэктар універсітэта Ф. М. Капуцкі, першы намеснік старшыні Вярхоўнага Савета БССР С. С. Шушкевіч і міністр народнай адукацыі БССР М. І. Дзямчук.

* * *

Прынята рашэнне стварыць на базе вылічальнага цэнтра лабараторыю па маркетынгу праграмных сродкаў універсітэта. Узначаліць яе на грамадскіх пачатках С. В. КОТАЎ.

НАЎЗДАГОН

У міністра свае аргументы

На сустрэчы з міністрам народнай адукацыі Беларусі Міхаілам Іванавічам ДЗЕМЧУКОМ, што адбылася 22 красавіка ў аргкамітэце па стварэнню гарадскога студэнцкага стачкома, прысутнічала 14 чалавек, у тым ліку 2 журналісты. За вокнамі гаркома камсамола, дзе вялі размову, ішлі з кветкамі да помніка Леніну малодшыя школьнікі, а наступны дзень зноў запоўніў плошчу, якая носіць яго імя, бастуючымі...

Сустрэча міністра са студэнтамі не мела мэты змяніць намеры тых, хто збіраўся выйсці наступнай раніцай на плошчу. Зноў абмяркоўвалі патрабаванні аргкамітэта да ўрада і Вярхоўнага Савета рэспублікі. Міхаіл Іванавіч прызнаў абгрунтаванымі значную частку з іх: неабходнасць зніжэння на 50 працэнтаў кошту праезду на ўсіх відах транспарту для студэнтаў; такога ж змянення кошту білетаў на культурна-відовішчныя мерапрыемствы і часткавай кампенсацыі харчавання ў сталовых.

Што датычыць патрабавання аргкамітэта аб 10-працэнтных асігнаваннях на адукацыю з рэспубліканскага бюджэту і аб павышэнні памераў студэнцкіх стыпендый да ўзроўню пражытковага мінімуму, то такія пункты ёсць у праекце Закона БССР «Аб адукацыі ў Беларускай ССР», які плануецца вынесці на зацвярджэнне бліжэйшай сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі. На працягу сустрэчы М. І. Дзямчук неаднаразова спасылаўся на гэты дакумент, але прадстаўнікі аргкамітэта прымалі далёка не ўсе яго аргументы.

Асабліва гэта датычыць той часткі размовы, якая была прысвечана аднаму з палітычных патрабаванняў студэнтаў — дэпартызацыі ВНУ. Міністр Дзямчук не прымае ў такім кантэксце нават сам тэрмін «дэпартызацыя». Ён лічыць, што ніводнага чалавека немагчыма адарваць ад ідэалогіі. Праект прадугледжвае, што «светапоглядная падрыхтоўка студэнтаў павінна ажыццяўляцца з улікам шматлікасці ідэалагічных канцэпцый, сусветнай грамадскай практыкі і права кожнага на ўласныя меркаванні і ацэнкі». Ён таксама забараняе кіруючым асобам у ВНУ звязваць сваю дзейнасць з рашэннямі палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў. Але члены аргкамітэта палічылі такую фармуліроўку не надта трывалай. Яны засталіся «пры сваіх інтарэсах». І 23 красавіка студэнты ВНУ Мінска ўбачылі пікеты з заклікамі аргкамітэта: «Мы не маем маральнага права заставацца ўбаку. Усе на плошчу!»

На сустрэчы 22 красавіка наш карэспандэнт паспеў задаць М. І. Дзямчуку пытанне з нагоды забастоўкі, якая рыхтавалася!

— Міхаіл Іванавіч, што б Вы сказалі тым выкладчыкам і студэнтам, якія выйдуць заўтра на плошчу?

— Што я магу ім сказаць? Кожны вольны выбіраць свой шлях... Мне здаецца, студэнтам і выкладчыкам няма сёння сэнсу выходзіць з эканамічнымі патрабаваннямі. Эканамічныя патрабаванні разумныя, калі яны ўгадваюць рэальна існуючы эканамічны механізм...

7 тысяч ліквідатараў памерлі (даныя Саюза «Чарнобыль», афіцыйнай статыстыкі няма).

4 мільёны 820 тысяч чалавек жывуць на радыеактыўных тэрыторыях.

2 мільёны 450 тысяч гектараў забруджана цэзіем-137.

250 мільярдаў рублёў складуць страты краіны да 2000 года (без уліку выдаткаў, звязаных з захворваннямі людзей).

ГУТАРКІ З НАГОДЫ...

...сацыяльнай абароны

18 красавіка Савет Міністраў БССР пацвердзіў сваю гатоўнасць зрабіць адказны крок — выйшла Пастанова за подпісам Старшыні Саўміна БССР М. Ф. Кебіча, якая прадугледзела павышэнне заработнай платы работнікам вышэйшай школы ў сярэднім на 50 працэнтаў.

Якую ролю ў «сацыяльна-абарончай» гісторыі адыграў прафсаюзны камітэт супрацоўнікаў універсітэта? Звернемся за адказам да яго старшыні **Анатоля Васільевіча ПАЎЛАВА.**

— Зразумела, тры месяцы назад ніхто дакладна не ведаў, ці рыхтуюцца адпаведныя рашэнні «наверсе», таму мы дзейнічалі са свайго боку. Яшчэ ў студзені Савет старшыняў прафкомаў ВНУ Мінска звярнуўся ў Вярхоўны Савет наконт паляпшэння сітуацыі з зарплатай работнікам вышэйшай школы. Тады ў нас адбылося па дзве сустрэчы з Н. М. Мазай і С. С. Шушкевічам, дзе мы ўбачылі разуменне нашых праблем і атрымалі падтрымку.

Пазней у рэспубліканскім друку з'явілася некалькі зваротаў нашага Савета з той жа нагоды, былі таксама выступленні па радыё і па тэлебачанні. Відавочна, што доўгачаканая пастанова была ў першую чаргу не іх вынікам. Але такі вывад не павінен засмучаць. Наадварот, ён надае ўпэўненасці, што мы пайшлі па адзіным у сённяшнім становішчы правільным шляху, абраўшы канстытуцыйныя метады барацьбы за свае інтарэсы. Мітынгі патрэбны, калі не дапамагае парламенцкая форма зносін. Здаецца, такі час яшчэ не надышоў...

— Вы лічыце павышэнне зарплаты тым, хто працуе ва універсітэце, значнай перамогай?

— Чаму ж, я добра разумею, што гэта толькі першы невялікі крок наперад. Жыццё і розум па-ранейшаму рыхтуюць неабходнасць перавагі заробкаў у вышэйшай школе над зарплатай у вытворчасці не менш чым у 1,5 раза.

Балючымі застаюцца пытанні сацыяльнай абароненасці — іх вырашэнне я лічу галоўнай задачай сённяшніх прафсаюзаў.

— А арганізацыя стачачных камітэтаў?

— Так, ва ўсім цывілізаваным свеце менавіта прафсаюзы — дырыжоры забастоўкі. У нас жа... пяць чалавек могуць заяўляць аб сабе як забастовачны камітэт усяго факультэта ці нават ВНУ. Праўда, гэта не мае пад сабою ніякай юрыдычнай сілы: стварыць падраздзяленні такі камітэт можа толькі пасля прадстаўнічага сходу працоўнага калектыву. З нагоды забастоўкі ён ва універсітэце не адбыўся...

Я перакананы: толькі калі канстытуцыйны шлях перастане дапамагаць у вырашэнні вострых праблем, тады можна і на плошчу — нам да яе блізка...

СТАРТ

Кафедра экалагічнага і сельскагаспадарчага права створана на юрыдычным факультэце.

Падзея гэта, як мы разумеем, мела свае перадумовы? Адказвае дэкан юрыдычнага факультэта *Валерый Мікалаевіч ГАДУНОЎ:*

— Выдзяленне самастойнай кафедры абумоўлена як значнасцю экалагічнага і сельскагаспадарчага права, так і зацікаўленасцю рэспублікі ў даследаваннях прававых пытанняў па ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы, ажыццяўленню зямельнай рэформы, развіццю розных форм уласнасці ў сельскай гаспадарцы. Ды і самі супрацоўнікі факультэта імкнуліся да павышэння ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў у гэтай галіне права. Таму пытанне аб стварэнні кафедры паўставала і раней (магчыма, яшчэ не так востра). Але не хапала для вырашэння яго ў дастатковай ступені падрыхтаваных кадраў. Цяпер, калі ў наяўнасці і кампетэнтныя асобы, новая кафедра мае поўнае права на існаванне.

У ЧАРНОБЫЛЬСКІ ФОНД

На 1000 рублёў

пабагацеў фонд будаўніцтва дзіцячага рэабілітацыйнага цэнтра пасля сумеснага пасяджэння савета сакратароў цэхавых партыйных арганізацый і партыйнага камітэта БДУ. Удзельнікі сустрэчы аднадушна падтрымалі прапанову аб пералічэнні чацвёртай часткі месячных партыйных узносаў, якія застаюцца ва універсітэцкай партыйнай арганізацыі, у фонд Беларускага экалагічнага саюза «Чарнобыль». А таксама выказалі пажаданне аб мэтавым пералічэнні гэтых грошай дзіцячаму рэабілітацыйнаму цэнтру.

ЗАГАД У ЛАД

Адным махам — загадам № 138 ад 18 сакавіка бягучага года пад назвай «Аб адмене фіксіраваных норм вучэбнай нагрузкі і абмежаванняў работы па сумяшчальніцтву штатным выкладчыкам ВНУ» — Дзяржаўны камітэт па адукацыі СССР ліквідаваў адразу некалькі ранейшых сваіх рашэнняў.

Адмена гэта амаль супадае па тэрміну з павышэннем рознічных цэн. Толькі, напэўна, адыграе яна зусім іншую функцыю. Не існуе больш для інстытуцкіх і універсітэцкіх выкладчыкаў абмежавання, якое патрабавала мець вучэбную нагрузку з ніжняй мяжой у 450 гадзін і з верхняй — у 1000 гадзін. Не трэба больш прафесарам і дацэнтам праводзіць за навучальны год 150 гадзін лекцыйных і семінарскіх заняткаў, ніхто цяпер не абмяжоўвае выкладчыкаў кафедраў 240 гадзінамі пагадзіннай нагрузкі. Яны, нарэшце, сталі больш вольнымі ў сваім выбары паміж навучальнай і метадычнай, навуковай і грамадскай работай.

Уяўляеце, каб даць такую ж волю нашым цэнам? Каб разумным шляхам пазбавіць іх усялякіх абмежаванняў... Тады б састарэлыя тавары каштавалі значна менш, чым свежыя, і апошніх, можна не сумнявацца, стала б больш.

А яшчэ добра было б, каб усе высокія загады і рашэнні клапаціліся пра справядлівасць. Стваральнікі загада № 138 не забыліся на яе — адмянілі ільготы для выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін у выглядзе 550 гадзін поўнай вучэбнай нагрузкі і 400 гадзін аўдыторнай.

Такім чынам, новы загад Дзяржкамадукацыі пачаў дзейнічаць. Загадчыкам кафедраў і выкладчыкам універсітэта застаецца толькі выконваць яго, не забываючыся пра ўмову, якая змяшчаецца ў калектыўным дагаворы прафсаюзнага камітэта і адміністрацыі Белдзяржуніверсітэта на 1991 год. Нагадваем, у бягучым навучальным годзе максімальная мяжа вучэбнай нагрузкі на аднаго выкладчыка — 760 гадзін.

ЗОНА БЯДЫ

«ЧАРНОБЫЛЬ — ДАПАМОГА»

...Калядная ёлка ўпрыгожвалася ўсё новымі «цацкамі». Да яе галінак прычэпвалі чарговыя ахвяраванні, часта на даволі кругленькую суму. У рэшце рэшт яна дасягнула амаль 90 мільёнаў рублёў.

Дапамогу сабралі без асаблівых намаганняў, а вось куды і як траціць гэтыя сродкі, на якія мэты адпускаць больш грошай, а якія патрэбы крышачку пачакаюць? І хоць кожны разумее, што ў «чарнобыльскай справе» няма другарадных патрэб, тым не менш відавочна, што кантроль за размеркаваннем неабходны. З гэтай мэтай і створаны ў Расіі, Беларусі і на Украіне на грамадскіх пачатках камітэты «Чарнобыль-дапамога».

Узначаліў яго ў нашай рэспубліцы першы намеснік старшыні Беларускага фонду міру М. Ф. Ягораў. Удзельнічаць у каардынацыі «марафонаўскіх» сродкаў па фінансаванню ўсіх акцый міласэрнасці будуць таксама віцэ-прэзідэнт Беларускага Экалагічнага Саюза, загадчык кафедры радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, прафесар Я. П. Пятраеў і загадчык аддзела сувязей з замежнымі краінамі па аказанню дапамогі ў ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС А. М. Рухля. У размове з нашым карэспандэнтам яны раскрылі адзін маленькі сакрэт: увайшоўшы ў састаў камітэта, яны маюць і ўласны намер — атрымаць хоць крыху грошай на будаўніцтва ў Беларусі аздараўленча-рэабілітацыйнага цэнтра для дзяцей, якія пражываюць на забруджаных тэрыторыях.

— Заўтра будзе пяць гадоў гэтай чорнай даце,— гаворыць А. М. Рухля.— Вынікі катастрофы з часам не становяцца суцяшальнымі. Мы называем выбух 26 красавіка злачынствам супраць чалавецтва. Значыць, віноўных патрэбна судзіць. На. жаль, ніхто з іх не сядзіць сёння за кратамі. Дык няхай хоць суд грамадскасці прымусіць іх усвядоміць усю сваю віну.

З гэтай мэтай 26 і 27 красавіка ў Кіеве пройдуць грамадскія слуханні па прычынах і выніках Чарнобыльскай аварыі. Сюды запрошаны вучоныя, юрысты, эксперты, а таксама галоўныя абвінаваўцы — людзі з «зоны». Падзея будзе шырока асвятляцца не толькі ў савецкім, але і замежным друку. Дарэчы, калегі-журналісты з ФРГ не прыедуць з пустымі рукамі — яны прывязуць медпрэпараты, аднаразовыя шпрыцы, прызначаныя для новай бальніцы, пабудаванай у пасёлку Славуціч.

— А інакш навошта тады брацца за гуж. Прывяду адзін прыклад. Нядаўна да адной з нашых апошніх распрацовак па выкарыстанню крышталічных сцінцылятараў праявіла вялікую цікаўнасць фірма «НАРДЭ». Складзены пратакол аб намерах, у якім, у прыватнасці, пацверджана дамоўленасць паміж нашым інстытутам і фірмай аб прамым узаемадзеянні. Мы, у сваю чаргу, бясплатна прапануем замежным калегам для правядзення першых выпрабаванняў узор сцінцылятара. Не хачу забягаць наперад, але я чамусьці ўпэўнены, што выпрабаванні пацвердзяць канкурэнтаздольнасць нашага вынаходніцтва.

— У выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС радыёнуклідамі забруджана значная частка тэрыторыі рэспублікі. Ці магчыма ў бліжэйшы час забяспечыць Беларусь прыладамі і абсталяваннем для радыяцыйнага кантролю?

— Наша асноўная задача сёння — кантроль за прадуктамі харчавання. У самы кароткі тэрмін мы абавязаны стварыць дакладную апаратуру і забяспечыць ёю кантрольныя пункты. Акрамя гэтага інстытут разам з іншымі навукова-даследчымі ўстановамі будзе займацца распрацоўкай прылад для кантролю забруджанасці глебы, паветра, вады, замеру радыядыйнага фону ў людзей.

Трэба адзначыць, што наша задача не толькі стварэнне апаратуры. Мы павінны распрацаваць стратэгію таго, што неабходна зрабіць наогул. Інстытут абавязаны таксама арганізаваць і выпуск прадукцыі, дакладней, мы будзем займацца ўсім — ад распрацоўкі да вырабу гатовых прылад.

— А грошы? Ці не будзе тут ускладненняў?

— Не думаю. Ёсць дзяржаўная праграма, і на яе ў бюджэце рэспублікі закладзены спецыяльныя сродкі. Праўда, могуць узнікнуць усялякія нечаканасці, але гэта праграма — выключэнне. Яна — праграма нашага болю.

Запісала
З. АЛЯШКЕВІЧ.

ПРАГРАМА НАШАГА БОЛЮ

Наша газета ўжо паведамляла, што ў канцы мінулага года Савет Міністраў Беларусі зацвердзіў, нарэшце, Рэспубліканскую навукова-тэхнічную праграму па стварэнню і вырабу апаратуры і абсталявання для забеспячэння радыёметрычнага і дазіметрычнага кантролю. Адказнымі выканаўцамі 10 з 22 пунктаў яе прызначаны падраздзяленні універсітэта — НДІ ЯП, кафедры ядзернай фізікі і радыяцыйнай хіміі. Як ідзе ажыццяўленне праграмы — аб гэтым наша гутарка з дырэктарам Навукова-даследчага інстытута адзерных праблем, прафесарам Уладзімірам Рыгоравічам БАРЫШЭЎСКІМ.

— Нарэшце доўгачаканая праграма стала рэальнасцю. Яна зацверджана і можна працаваць. Але ці не спазніліся мы зноў?

— Так, час упушчаны. Вучоныя даўно выказвалі і абгрунтоўвалі свае прапановы. Ужо ў першыя гады пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС узнімалася пытанне аб неабходнасці распрацоўкі і вырабу апаратуры для дакладнага радыёметрычнага і дазіметрычнага кантролю. Але наша кіраўніцтва, відаць, не да канца разумела вастрыню праблемы. Аб гэтым сведчыць і той факт, што маштабы катастрофы знарок замоўчваліся, а нас супакойвалі, быццам нічога страшнага не здарылася.

Негатыўную ролю адыграла і спрадвечнае спадзяванне на падказку і дапамогу «зверху». І ў гэтым выпадку мы цешылі сябе надзеяй, што цэнтр дасць нам усё неабходнае. Але, як высветлілася, Мінатамэнергапром — адказны за стварэнне адпаведнай апаратуры, не ў стане забяспечыць усе патрэбы. Ды і наогул з прыладабудаваннем у нас не ўсё добра. Дарэчы, чакаць ад Саюза выдзялення нейкіх фінансавых сродкаў таксама дарэмна. Так што я ўпэўнены — народная мудрасць правільна сцвярджае: лепш позна, чым ніколі.

Многія з нас, відаць, цешаць сябе надзеяй, што праз пяць-дзесяць гадоў нам не патрэбны будуць такія прылады. На жаль, гэта не так. Яшчэ доўга Чарнобыль будзе адгукацца ў нас болем у сэрцы, непажаданымі зменамі ў сістэме кровазвароту, пакутамі, выкліканымі анкалагічнымі захворваннямі...

— Напэўна, калі ў нас не было падобнай праграмы раней, то нельга сцвярджаць, што ў рэспубліцы нічога не рабілася ў гэтым напрамку?

— Вядома, не. Многае, у прыватнасці, робіцца кафедрай ядзернай фізікі. Напрыклад, прадукты, якія паступаюць на Камароўскі рынак, а таксама малако праходзяць радыяцыйны кантроль пры дапамозе распрацаваных тут радыёметраў. Імі карыстаюцца на прадпрыемствах Магілёўскай і Гомельскай абласцей.

Не так даўно пры кафедры створана малое прадпрыемства. Яно займаецца распрацоўкай і выпускам маласерыйных радыёметраў для кантролю прадуктаў харчавання і спектрометраў для аналізу ізатопнага саставу проб навакольнага асяроддзя.

І яшчэ два важныя напрамкі работы кафедры. У навукова-даследчай лабараторыі радыяцыйных метадаў неразбуральнага кантролю, што працуе пры кафедры, вядуцца работы па стварэнню стацыянарнага аўтаматызаванага гамарадыёметра і палявога экспрэсаналізатара ізатопнага саставу радыёнуклідаў у прыродных аб'ектах. З дапамогай апошняга мы зможам, нарэшце, «адшукваць» стронцый.

— Уладзімір Рыгоравіч, а ці мае які-небудзь задзел у распрацоўцы прылад радыёлагічнага і дазіметрычнага кантролю ваш інстытут?

— Да прыняцця праграмы мы гэтым не займаліся — не было грошай. Але адпаведныя прапановы выказвалі ўжо тры гады назад. Так што нельга сказаць, быццам давядзецца пачынаць з нуля.

Хачу адзначыць вось што. Урадавая праграма прынята, так бы мовіць, не толькі, каб закрыць нейкія надзённыя праблемы. Мы павінны — стварыць адпаведную вытворчасць і такім чынам пазбавіцца залежнасці ад розных саюзных ведамстваў.

Распрацоўка і выраб падобнай апаратуры патрабуе велізарных матэрыяльных затрат. Прычым, аддачы ад такіх работ чакаць дарэмна. Мы ж, заняўшыся гэтай справай, мяркуем дабіцца пэўнай акупнасці. Асноўная ўмова паспеху — стварэнне канкурэнтаздольных прылад, якія б адпавядалі сусветным стандартам, і, безумоўна, іх продаж.

— І ёсць падставы прэтэндаваць на канкурэнтаздольнасць?

Гімн і сцяг беларусаў

Ці былі ў Беларусі адразу пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі свае нацыянальныя гімн і сцяг?

А. ПАЎЛОВІЧ.

Адказвае старшы навуковы супрацоўнік гістарычнага факультэта універсітэта Валерый Сямёнавіч КАСМЫЛЁЎ:

— Гістарычны лёс нашай рэспублікі пасля рэвалюцыі склаўся так, што адразу некалькі беларускіх песень неафіцыйна лічыліся нацыянальным гімнам. Напрыклад, адначасова прэтэндавалі на гэта званне «А хто там ідзе?» (словы Я. Купалы, музыка Л. Рагоўскага), «Беларуская марсельеза». А песня У. Тэраўскага на словы М. Краўцова «Мы выйдзем шчыльнымі радамі», прызнаная як ваенны гімн БНР, і пасля вызвалення рэспублікі ад белапалякаў доўгі час заставалася ваенным гімнам беларусаў.

Нявызначанасць у нацыянальных гімнах існавала ў нас да 1943 года, калі СНК БССР аб'явіў конкурс на стварэнне беларускага гімна. У ім прымалі ўдзел вядомыя ў рэспубліцы паэты, у тым ліку і Я. Колас. І, нарэшце, 1 кастрычніка 1955 года ў Мінску на вечары савецка-польскай дружбы ў Беларускім акадэмічным тэатры оперы і балета ўпершыню афіцыйна прагучаў дзяржаўны гімн нашага народа — «Мы — беларусы» (словы М. Клімковіча, музыка Н. Сакалоўскага).

Верагодней за ўсё ў 1917-м — 1918-м гадах на маніфестацыях і мітынгах «суіснавала» адразу некалькі сцягаў, сярод якіх нейкі час прысутнічаў нават белы.

Першы афіцыйны зацверджаны І Усебеларускім з'ездам Саветаў сцяг быў чырвоным з залатымі літарамі С.С.Р.Б. у левым вугле ля дрэўка. Утварэнне ў лютым 1917 года Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі не магло не выклікаць і змены ў сімволіцы — сцяг уяўляе сабой чырвонае палотнішча без усялякіх адлюстраванняў і надпісаў. Праз паўтара года згодна з «Дэкларацыяй аб абвяшчэнні незалежнасці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусь» сцяг быў адноўлены ў першапачатковым выглядзе. І толькі 25 снежня 1951 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР зацвердзіў новы сцяг Беларускай ССР з наглядна выражанымі асаблівасцямі рэспублікі: зялёны колер — колер надзеі, дастатку, свабоды — стаў адначасова ўвасабляць і лясныя багацці Беларусі; у арнаменце, выкананым у стылі вядомых слуцкіх паясоў, знайшла адлюстраванне мастацкая творчасць беларускага народа.

АФІЦЫЙНЫ АДДЗЕЛ

ПАСТАНОВА

АБ УДЗЕЛЕ КАМУНІСТАЎ УНІВЕРСІТЭТА ў рэалізацыі праграмы беларусізацыі навучання і выхавання студэнцкай моладзі

1. Партыйным бюро факультэтаў і падраздзяленняў сумесна з адміністрацыяй, СПК у тэрмін да 25 красавіка распрацаваць праграму канкрэтных мер па развіццю беларускарускага двухмоўя з улікам спецыфікі кожнага падраздзялення.

2. Рэкамендаваць рэктарату абнавіць састаў камісіі па арганізацыі работы па беларусізацыі ва універсітэце, прапанаваць у яе састаў ад парткома камуніста Б. Ю. Нормана.

3. Прарэктару універсітэта, камуністу П. І. Брыгадзіну арганізаваць каардынацыю работы па складанню і рэалізацыі адзінага плана выпуску вучэбнай літаратуры, неабходнай для правядзення беларусізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу.

4. У мэтах больш паспяховага авалодання студэнтамі прыродазнаўчых факультэтаў спецыяльнай тэрміналогіяй, партыйным бюро факультэтаў сумесна з адміністрацыяй на працягу сакавіка-красавіка месяцаў гэтага года разгледзець пытанне арганізацыі на факультэтах курсаў беларускай мовы для ўсіх жадаючых.

5. Партыйным бюро факультэтаў і падраздзяленняў сумесна з адміністрацыяй на працягу красавіка-мая гэтага года вызначыць канкрэтныя меры па карэннаму абнаўленню нагляднай агітацыі з улікам дасягненняў нацыянальнай беларускай навукі і культуры, спецыфікі і профілю факультэтаў і падраздзяленняў. Парткому універсітэта, партыйным бюро факультэтаў і падраздзяленняў выдзеліць для гэтага неабходныя грашовыя сродкі.

6. Партыйным бюро факультэтаў і падраздзяленняў актывізаваць работу па пераводу партыйнага справаводства на беларускую мову. Камуністам-кіраўнікам больш актыўна весці работу па пераводу на беларускую мову справаводства, якое звязана з вучэбна-выхаваўчым працэсам, па змяненню адносін да выкарыстання беларускай мовы ў сферы афіцыйных зносін.

7. Партыйным бюро факультэтаў і падраздзяленняў рэгулярна заслухоўваць на партыйных бюро і сходах справаздачы камуністаў, якія персанальна адказваюць за выкананне канкрэтных мер па беларусізацыі на факультэтах, кафедрах, у лабараторыях, аддзелах і іншых падраздзяленнях. Правесці ў маі гэтага года ва ўсіх цэхавых партыйных арганізацыях партыйныя сходы, на якіх разгледзець удзел камуністаў у арганізацыі і правядзенні работы па беларусізацыі ва універсітэце.

8. У мэтах стымулявання вывучэння студэнцкай моладдзю беларускай мовы і літаратуры, развіцця ва універсітэце нацыянальнай культуры, этнаграфіі і мастацтва з першага верасня 1991 года зацвердзіць наступныя формы матэрыяльнага заахвочвання:

— стыпендыю парткома імя Ф. Скарыны (асобна для гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў) памерам 50 рублёў кожная, штомесячна за вывучэнне і прапаганду беларускай мовы і літаратуры;

— прэмію памерам 300 рублёў лепшаму творчаму калектыву, які дасягнуў поспехаў у развіцці прапаганды беларускай культуры і мастацтва.

Даручыць намесніку сакратара парткома Л. М. Гайдукевічу і члену парткома Б. Ю. Норману у тэрмін да 15 красавіка распрацаваць неабходныя Палажэнні па зацверджаных матэрыяльных заахвочваннях.

9. Даручыць члену парткома, камуністу М. Г. Загорскай наладзіць у газеце «Беларускі універсітэт», рэспубліканскай прэсе рэгулярнае асвятленне ўдзелу камуністаў універсітэта ў рабоце па беларусізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу.

10. Партыйным бюро факультэтаў і падраздзяленняў універсітэта звярнуць асаблівую ўвагу на арганізацыйнае ўмацаванне аддзялення Таварыства беларускай мовы (ТБМ), аказваць усялякую ім падтрымку ў іх практычнай дзейнасці.

11. Інфармацыю аб ходзе выканання данай пастановы разгледзець у кастрычніку гэтага года, кантроль за яе выкананнем ускласці на намесніка сакратара парткома Л. М. Гайдукевіча.

Homo sapiens

У ЛЮДЗЕЙ, ЯК У ЗВЯРОЎ?

Пра біяпалітыку ў нас загаварылі зусім нядаўна. Спалучэнне біялогіі з паліталогіяй — гэта здавалася амаль што блюзнерствам. Як можна параўноўваць мітусню неразумных мошачак і звяркоў са свядомай дзейнасцю «гома сапіенс»?! Але знайшліся людзі, якія заўважылі нямала агульнага ў жыцці тых і іншых. Аказалася, яны жывуць па агульных прыродных законах, «сацыяльны вопыт» некаторых жывёл можа быць карысны і нам, разумным. Першыя біяпалітыкі з'явіліся гадоў трыццаць назад на Захадзе, а зараз іх паслядоўнікі знайшліся і ў нас.

Пакуль, праўда, не ў нашым універсітэце. Таму цікаўным прапануем гутарку карэспандэнта «Поиска» Андрэя ШЫЦІКАВА ***з навуковым супрацоўнікам Маскоўскага універсітэта, кандыдатам біялагічных навук*** Аляксандрам АЛЕКСІНЫМ.

— Аляксандр Уладзіміравіч, мне, шчыра кажучы, цяжка ўявіць, якім чынам можна выкарыстоўваць біялагічныя веды ў паліталогіі?

— Вядома, што жывёлы звычайна аб'яднаны ў нейкія групы. Узаемаадносіны ў гэтых групах вызначаюцца прыроднымі інстынктамі. Якім бы парадаксальным гэта ні здавалася, але і чалавечыя згуртаванні трымаюцца на такіх жа інстынктах. Гэта і дазваляе вучоным-біяпалітыкам праводзіць аналогіі паміж жывёламі і чалавечымі аб'яднаннямі, аналізаваць палітычную дзейнасць чалавека, зыходзячы з біялагічных аксіём.

— Вы хочаце сказаць, што чалавек у сваёй сацыяльна-палітычнай дзейнасці пасля тысячагоддзяў эвалюцыі працягвае кіравацца першабытнымі інстынктамі? А як жа розум?

— Чалавек — істота ўнікальная. Яму аднаму адначасова ўласцівы і моцны розум, і жывёльныя інстынкты. Таму, зразумела, нельга сказаць, што ў сацыяльным жыцці чалавек спадзяецца толькі на інстынкты. Але і не заўсёды яго рашэнні заснаваны на разумным разліку. Да дзеяння могуць пабуджаць гнеў, страх, агіда, што хочаш...

— Але гэта, хутчэй, выключэнне з правілаў. А заканамернасці?

— Вось, напрыклад, праблема ўлады. Тут і людзі, і звяры паводзяць сябе аднолькава — ствараюць іерархічныя структуры. Не толькі ў высокаарганізаваных жывёлін, але нават у аднаклетачных ёсць «дырыжоры» і «выканаўцы».

— Ці так ужо падобны гэтыя структуры? У звяроў яны будуюцца на фізічнай сіле, а ў людзей, прабачце, ёсць яшчэ і іншыя крытэрыі размеркавання роляў — капітал, службовае становішча, узровень інтэлекту.

— Вядома, фізічная сіла адыгрывае важную ролю ў згуртаваннях жывёлін, але далёка не заўсёды лідэрам становіцца самы дужы. І ў іх існуюць яшчэ такія-сякія крытэрыі «адбору», якія да канца яшчэ не вывучаны.

Наогул, як у чалавечых, так і ў жывёльных згуртаваннях сустракаюцца ўсяго толькі тры тыпы паводзін індывідуумаў. Адзін з іх — агрэсія, імкненне калі не знішчыць, то аслабіць, падпарадкаваць сабе іншую істоту.

— А людзі агрэсіўныя ў такой жа ступені, як і жывёлы?

— Часам нават у большай. У дзіцячых садах праводзіўся цікавы эксперымент. Аднаму з малых давалі якую-небудзь цікавую цацку. Як жа паводзілі сябе астатнія? У 80 працэнтах выпадкаў справа даходзіла да пагроз на адрас уладальніка цацкі ці нават да бойкі. Пры аналагічным эксперыменце з дзіцем шымпанзэ агрэсіўнасць праяўлялася толькі ў 20 выпадках са 100.

— І як вы гэта растлумачыце?

— Аўстрыйскі этолаг К. Лорэнц лічыў агрэсію фундаментальнай уласцівасцю жывога. Прычым у чалавека агрэсія праяўляецца не толькі пры відавочных канфліктах. Можна ж аспрэчваць першынства ў навуцы, на палітычных выбарах, пры гульні ў шахматы...

— І спорт таксама праяўленне агрэсіі?

— Нават барацьбу за мір некаторыя лічаць «адухатворанай» формай агрэсіі.

— Але ж не толькі на агрэсіўнасці замешана жыццё?

— Вядома, існуюць і іншыя віды ўзаемадзеяння. Напрыклад, «кааперацыя». Лішайнік — сімбіёз грыба і водарасці. А ў тэрмітаў у кішэчніку жывуць мікраскапічныя істоты, якія дапамагаюць насякомым разбураць драўніну.

— Кааперацыя — гэта заўсёды ўзаемная выгада?

— Часам «супрацоўніцтва» ўзнікае з прымітыўнага паразітызму. Спачатку паразіт спрабуе адразу забіць, разарыць «гаспадара», але, «асэнсаваўшы» недальнабачнасць сваіх памкненняў, змяняе паводзіны.

Ёсць яшчэ варыянт узаемаадносін жывых істот — ізаляцыя, калі істоты проста ўхіляюцца ад кантакту.

— Але ў жыцці нячаста сустракаюцца чыстыя «агрэсары» ці тыя, хто адназначна імкнецца да ізаляцыі.



— Сапраўды, часцей можна назіраць «спляценне» ўсіх трох тыпаў узаемаадносін. Проста ў канкрэтных выпадках нешта адно бярэ верх.

— Падобна, сёння нашы суграмадзяне больш схільныя да агрэсіі.

— Гэта заканамерна, таму што жыццё становіцца горшым. Многім даводзіцца змагацца за выжыванне. Але, дарэчы, калі мы ўсё-такі адважымся перайсці да рыначных адносін і пачнецца рэальная канкурэнцыя, узровень агрэсіўнасці, відаць, яшчэ павялічыцца. Няцяжка прадказаць, напрыклад, далейшы рост крымінальнага злачынства.

— Як жа ўтрымаць хвалю нарастаючай агрэсіўнасці ў прыймальных рамках?

— Гэта перш за ўсё клопат эканамістаў і юрыстаў, якія павінны даказаць грамадзянам, што прыроджаную агрэсіўнасць значна больш выгадна праяўляць у бізнесе, чым у той жа крымінальшчыне.

— А біяпалітыкі могуць што-небудзь параіць?

— Хутчэй падзяліцца карыснымі назіраннямі. Напрыклад, у многіх відаў рыб прыняты даволі гуманныя «законы». Канкурэнцыя назіраецца толькі паміж асобінамі аднолькавых памераў, узросту, полу. Толькі роўныя дазваляюць сабе агрэсію ў адносінах адзін да другога.

Пры канкурэнцыі роўных паслабляецца іерархія. І ў адрозненне ад таталітарных структур, якія падаўляюць свабодную канкурэнцыю, у дэмакратычных згуртаваннях магчыма мірнае раздзяленне ўлады без жорсткай канфрантацыі палітычных груповак. Такі прынцып размеркавання ўлады характэрны для некаторых качавых жывёл: у антылоп адзін лідэр кіруе рухам групы ў падарожжы, другі правіць у час вадапою. Напэўна, падыходзячая мадэль для айчынных палітыкаў...

ЯКРАЗ ДЛЯ ВАС

У наш імклівы час больш за 90 працэнтаў людзей пакутуюць слабасцю, стамляльнасцю, скардзяцца на пастаянную «нясвежую» галаву і «напаўздаровы арганізм». Знаёмы для студэнта стан, праўда?

Масаж дапамагае паскорыць лячэнне такіх цяжкіх хвароб, як інфаркт міякарда, ішэмічная хвароба сэрца, гіпертанічная хвароба, інсульт, пераломы касцей, захворванні лёгкіх, пазваночніка — астэахандрозы, хандрозы, скаліёзы, шырока выкарыстоўваецца ў педыятрыі, эфектыўны пры малых дозах абпраменьвання.

Ён не толькі аказвае лячэбнае ўздзеянне, але і стымулюе абарончыя сілы арганізму, неабходныя для прафілактыкі захворванняў.

Масаж бярэ пачатак ад інстынктыўнай чалавечай рэакцыі націскаць пальцам на балючую частку цела. Садзейнічаючы мабілізацыі прыродных абарончых сіл арганізму, ён можа рабіць сапраўдныя цуды там, дзе многія па звычцы схільныя хапацца за таблеткі ці ін'екцыі.

Масажыст з дзесяцігадовым практычным стажам і гадамі выхаванай чуласцю, з расцэнкамі НІЖЭЙ ДЗЯРЖАЎНЫХ У ДВА РАЗЫ чакае ўсіх бедных студэнтаў на вул. Маскоўскай, 15 з 10 да 16 гадзін штодня, акрамя выхадных. Малое прадпрыемства «Гранд» пры універсітэце чакае сваіх наведвальнікаў.

ДА ЎВАГІ

КІРАЎНІКОЎ

прадпрыемстваў, падраздзяленняў, арганізацый і кааператываў, а таксама ўсіх зацікаўленых асоб, якія маюць вынаходніцтвы, распрацоўкі тыпу «НОУ-ХАУ» і г. д.

Маладзёжны цэнтр БДУ імя У. І. Леніна «АЛЬЯНС» прапануе свае паслугі і гатоў да супрацоўніцтва ў распрацоўцы, вырабу і ўкараненні рознай навукова-тэхнічнай прадукцыі. Цэнтр праводзіць падбор распрацовак, ідэй, вынаходніцтваў для заключэння кантрактаў з замежнымі фірмамі, для ўкаранення найбольш цікавых з іх як у СССР, так і за мяжой. Вынаходнік набывае ўнікальную магчымасць атрымаць узнагароджанне ў валюце.

Спецыялісты Цэнтра:

— заключаць дагаворы з ВТК на правядзенне навукова-даследчых работ на ўзаемавыгадных умовах (як па дзяржаўных, так і па дагаворных цэнах);

— выканаюць праектна-канструктарскія, інфармацыйна-вылічальныя,рэкламныя работы (на ўмовах, прапанаваных творчым калектывам);

— зробяць пастаўку, наладку і запуск вылічальнай тэхнікі і сродкаў аўтаматызацыі (магчыма пастаўка і ўкараненне ПТК на базе ЭВМ тыпу IBM PC);

— правядуць пошук заказчыкаў і маркетынг Вашай прадукцыі;

— акажуць паслугі ў пракаце, рэалізацыі і распаўсюджанні аўдыё- і відэапрадукцыі, у правядзенні тэматычных вечароў;

— прымуць заяўкі на правядзенне тэматычных вечароў адпачынку, студэнцкіх вяселляў у маладзёжным кафэ «Гаўдэамус» і клубе «Палітыкус».

Адрас маладзёжнага цэнтра «Альянс»:

220080 г. Мінск, Ленінскі пр., 4 галоўны корпус універсітэта, пакой 311.

Тэлефоны: 20-66-85, 26-57-45 (прыёмная), 20-96-13 — бухгалтэрыя.

Цэнтр «АЛЬЯНС» — Ваш надзейны партнёр!

ВІТАМІНЫ

Вясна — цудоўная пара года. Але нярэдка яна азмрочваецца дрэнным самаадчуваннем: з'яўляюцца санлівасць, галоўны боль, хуткая стамляльнасць. Абвастраюцца хранічныя захворванні. Гэта звязана з недахопам у арганізме вітамінаў. Вясной нам хочацца кісленькага, востранькага, чаго-небудзь асаблівага. Мы гаворым: «З'еў бы, ды што не ведаю сам».



Старэйшыя памятаюць, як у дзяцінстве маці карміла супам з маладой крапівы, нахвальваючы гэту расліну. Няма сумнення — крапіва карысная. Яна ўтрымлівае шмат вітамінаў. Якая ж іх роля?

Вітаміны — гэта актыўныя біялагічныя спалучэнні, якія з'яўляюцца рэгулятарам хімічных рэакцый у арганізме. Недахоп вітамінаў прыводзіць да развіцця розных захворванняў, зніжае ўстойлівасць да інфекцый. А, В, С, Д, Е, К, У, Р, РР — гэта тыя вітаміны, якія неабходны нашаму арганізму і большую частку якіх чалавек атрымлівае разам з ежай.

Для таго, каб чалавек атрымаў неабходную іх колькасць, патрэбна ведаць, як правільна апрацоўваць прадукты. Вітамін С хутка разбураецца, таму прадукты, што ўтрымліваюць яго, нельга пакідаць на святле, свежазамарожаныя пасля адтайвання патрэбна адразу ж ужываць у ежу. Яблыкі нельга цёрці на металічнай тарцы, таму што, сутыкаючыся з металам, вітамін С разбураецца. Карысці ад такога пюрэ дзецям не будзе. Чысціць садавіну і гародніну трэба адразу перад ужываннем, закладваць прадукты ў кіпячую салёную ваду і варыць у эмаліраваным посудзе.

Каб не ўзнікла вітамінная недастатковасць, важна рабіць харчаванне разнастайным, таму што многія прадукты багатыя не толькі адным вітамінам, а некалькімі. У вясновы перыяд колькасць іх у садавіне і гародніне памяншаецца, таму мэтазгодна ўжываць у ежу зяленіва круглы год. Хранічным хворым вясной і восенню добра было б прымаць прэпараты: ундывіт, гаксавіт, рэвіт і іншыя. Часам я заўважаю, як дзеці купляюць у аптэцы вітамін С без прызначэння ўрача. Хачу сказаць: прымаць вітамін патрэбна з улікам стану арганізму, а выбар дакладных дозаў — гэта справа лечачага ўрача.

Г. ГАЛЬЧАНЮК,
урач.

Не атрымалі сёння...

Я знарок не буду называць сваё прозвішча — не хачу непатрэбных размоў і косых позіркаў. Упэўнена, многія, прачытаўшы гэту заметку, папракнуць мяне, маўляў, усё ёй мала. І кампенсацыю дзяржава дала, і пра дзяцей паклапацілася, і пра індэксацыю таксама ўсё больш настойліва распаўсюджваюцца чуткі.

За гэта, вядома, дзякуй. І ўсё ж, хоць не ўсім пагражае жабрацтва, але да рысы беднасці наблізяцца многія.

Чула, што на аўтазаводзе ўжо ў гэтым месяцы зарплата ўзрасце на 30 працэнтаў. Часткова будзе кампенсаваны і кошт абедаў у заводскіх сталовых, а там-сям аплочваюць праезд у грамадскім транспарце.

А мы нават кампенсацыю на дзяцей атрымаць не можам. Ці думае кіраўніцтва універсітэта клапаціцца аб сацыяльнай абароне сваіх супрацоўнікаў? У першую чарту я маю на ўвазе тых, хто па-ранейшаму «сядзіць» на 180 рублях. Што рабіць ім: пісаць заяву на звальненне ці чакаць, калі пра іх успомняць?

С. К.,
супрацоўніца.

...Чакайце заўтра

ГЭТА ПІСЬМО МЫ ПАПРАСІЛІ ПРАКАМЕНЦІРАВАЦЬ ГАЛОЎНАГА БУХГАЛТАРА УНІВЕРСІТЭТА ВАЛЯНЦІНУ ПЯТРОЎНУ САЛАДУХА.

— Не зусім разумею аўтара пісьма: хто прымушае «сядзець» на 180 рублях? Калі ласка, зарабляйце больш. Якім чынам? Вось тут ужо кожны павінен паклапаціцца сам. Разумею, цяжка пазбавіцца ад выпрацаванай за 70 гадоў утрыманскай пазіцыі.

Што датычыць канкрэтна сацыяльнай абароны выкладчыкаў і супрацоўнікаў, то ўгнацца за прамысловымі прадпрыемствамі мы не ў стане. Добра, што хоць так-сяк падтрымалі студэнтаў.

З таго мільёна прыбытку, што ёсць у нас, мяркуем хоць крыху кампенсаваць кошт пуцёвак і, калі атрымаецца, даць кожнаму выкладчыку і супрацоўніку матэрыяльную дапамогу да адпачынку. На абеды і праязныя, на жаль, давядзецца выкладваць грошы з уласнай кішэні.

А зараз пра кампенсацыі. Мне здаецца, многія забываюць, што супрацоўнікі бухгалтэрыі таксама людзі, а не машыны. Апошнім часам мы ледзь спраўляемся налічваць усялякія кампенсацыі, індэксацыі... Першыя ведамасці на іх атрыманне ўжо перададзены ў касы, так што хутка гэта праблема страціць сваю актуальнасць.

Дарэчы, многія скардзяцца на тое, што не выплочваем штоквартальную кампенсацыю ў сувязі з падаражаннем дзіцячага асартыменту. Тлумачу: па інструкцыі мы павінны рабіць гэта кожны другі месяц квартала. Так што чакайце 18 мая. І не турбуйцеся, нікуды вашы грошы не дзенуцца: не атрымалі сёння, атрымаеце заўтра.

ЧАРНОБЫЛЬ: 5 ГАДОЎ ПАСЛЯ

СКАЖЫЦЕ ПРАЎДУ...

КАЛІ СКЛАСЦІ ПРАГНОЗ НА НЕКАЛЬКІ ГАДОЎ НАПЕРАД, ЯКІМ ЁН БУДЗЕ?

Адказвае загадчык кафедры Мінскага медыцынскага інстытута, доктар медыцынскіх навук, прафесар Я. ЧАРСТВЫ:

— Тыя даныя, якія мы сёння маем у выніку тысяч аналізаў, абследаванняў, назіранняў за мутацыйнымі працэсамі, вывады вучоных-медыкаў розных спецыяльнасцей дазваляюць нам даволі ўпэўнена рабіць аптымістычны прагноз: павелічэння прыроджаных парокаў і спадчынных захворванняў не чакаецца. Толькі пры ўмове захавання прафілактычных мер у харчаванні насельніцтва.

«СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ», 26.10.1987 г.



Міністр аховы здароўя БССР В. С. Улашчык адзначыў, што адразу пасля катастрофы медыкі не заўсёды кампетэнтна і аб'ектыўна інфармавалі людзей аб маштабах і магчымых выніках аварыі. Напрыклад, сёння прызнаны некарэктнымі некаторыя змяненні дозы абпраменьвання шчытападобнай залозы, якія выказаны пасля аварыі. Таму зараз беларускія медыкі праводзяць удакладненні гэтых доз. І работа гэта блізкая да завяршэння.

— *На кім ляжыць адказнасць за запозненае інфармаванне насельніцтва аб радыяцыйнай небяспецы і неабходнасці ёднай прафілактыкі, мяркуючы па публікацыях у друку, Мінздраў рэспублікі меў інфармацыю для своечасовага прыняцця рашэнняў?*

Адказ: ёдная прафілактыка як сродак аховы шчытападобнай залозы павінна была праводзіцца з першых часоў пасля аварыі. Пачалі прымяненне прэпаратаў стабільнага ёду ў асноўным на 4—6 дзень. Думаю, вінаваты ў гэтым многія: і грамадзянская абарона, і Мінздраў БССР, і партыўныя, савецкія органы, і медыкі на месцах. Ды і самі жыхары не заўсёды выконвалі ўказанні ўрачоў.

(З МАТЭРЫЯЛАЎ ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫІ ЧЛЕНАЎ КАМІСІІ БЮРО ЦК КПБ І САВЕТА МІНІСТРАЎ ПА ЛІКВІДАЦЫІ ВЫНІКАЎ АВАРЫІ НА ЧАЭС).

ДВА АДКАЗЫ НА ПЫТАННЕ

ЯК «ЗДАРОЎЁ» АВАРЫЙНАГА БЛОКА?

«Советская Белоруссия». 25.04.87 г.

Правядзене ў кароткі тэрмін мантажна-будаўнічых работ па стварэнню аб'екта «Укрыцце» (Саркафаг») поўнасцю выключае магчымасць пападання радыеактыўных рэчываў у атмасферу з аварыйнага энергаблока.

Дакладнае назіранне за ім дазваляе сцвярджаць, што стан яго бяспечны і знаходзіцца цалкам пад кантролем. Разам з тым, работы па ліквідацыі вынікаў аварыі на станцыі працягваюцца.

Сёлетняя вясна — этап адказнай работы, звязанай з магчымасцю міграцыі радыеактыўных забруджанняў у час паводкі. Спрыяльны прагноз вучоных аб магчымасці прадухілення забруджання рэк веснавой паводкай пацвярджаецца. Пабудавана больш за 130 ахоўных дамбаў, каналаў, пастак.

Адказаць на пытанне карэспандэнт «7 дней» папрасіў вядучага навуковага супрацоўніка Інстытута ядзернай энергетыкі АН БССР, кандыдата тэхнічных навук Уладзіміра СКУРАТА.

— Аб'ект «Укрыцце» (ці інакш «Саркафаг»), збудаваны пасля аварыі на ЧАЭС у 1986 годзе для прадухілення выкідаў у навакольнае асяроддзе радыеактыўных рэчываў, аснашчаны неабходнымі сістэмамі забеспячэння бяспечнай работы. З моманту ўвода «Укрыцця» ў эксплуатацыю не было зафіксавана ніводнага выпадка выхаду за яго межы хоць нейкай значнай колькасці радыеактыўных рэчываў. Таму чуткі, якія ўпарта распаўсюджваюцца на хвалях АБС (адна бабуля сказала), аб выкідах аблокаў радыеактыўных рэчываў, пазбаўлены падстаў.

Паколькі сёння паліва ў памяшканнях аварыйнага блока не разгараецца, прычын для фарміравання выкідаў няма. За тэмпературай паліва вядзецца пастаяннае назіранне.

— *Значыць, сёння небяспека паступлення радыеактыўных рэчываў у навакольнае асяроддзе цалкам выключана?*

— Яна існуе толькі для людзей, якія працуюць на пляцоўцы Чарнобыльскай АЭС, бо радыеактыўны паліўны пыл, што ўтварыўся ў час выбуху, па-ранейшаму знаходзіцца ў многіх памяшканнях аварыйнага блока. Але і тут каб пазбегнуць пад'ёму і пераносу пылу пры магчымым абвальванні бэлек, перакрыццяў, кавалкаў сцен у 1987—89 гадах былі праведзены работы па замацаванню ненадзейных будаўнічых канструкцый. Пастаянна праводзяцца і мерапрыемствы па пылападаўленню: на ўсе паверхні наносіцца спецыяльны састаў, які звязвае пыл і ўтварае ахоўную плёнку. Для людзей, што жывуць за межамі зоны адсялення, гэты пыл не ўяўляе небяспекі, бо ён не можа пераносіцца на вялікія адлегласці.

— *Але аб'ект «Укрыцце» разлічаны на эксплуатацыю толькі на працягу 20—30 гадоў...*

— Сёння вывучаюцца розныя варыянты яго пераўтварэння ў збудаванне, якое абсалютна выключыць на доўгі час магчымасць пранікнення радыеактыўных рэчываў у навакольнае асяроддзе. Хацелася б, каб аптымальнае рашэнне па пахаванню аварыйнага блока было знойдзена ў выніку правядзення міжнароднага конкурсу.

Ігар ГУКОЎСКІ.
«7 дней», красавік 1991.

1.05.86. «Советская Белоруссия». 3-я стар.

Гэта патрэбна жывым...

АД САВЕТА МІНІСТРАЎ СССР.

Як ужо паведамлялася ў друку, на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, якая знаходзіцца на 130 кіламетраў на поўнач ад Кіева, адбылася аварыя.

На месцы працуе ўрадавая камісія пад кіраўніцтвам намесніка Старшыні Савета Міністраў СССР т. Шчарбіны Б. Е. У яе састаў увайшлі кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, вядомыя вучоныя і спецыялісты.

Па папярэдніх даных аварыя адбылася ў адным з памяшканняў 4-га энергаблока і прывяла да разбурэння часткі будаўнічых канструкцый будынка рэактара, яго пашкоджання і некаторай уцечкі радыеактыўных рэчываў.

Прыняты першачарговыя меры па ліквідацыі вынікаў аварыі. У гэты час радыяцыйная абстаноўка на электрастанцыі і мясцовасці побач з ёй стабілізавана, пацярпеўшым аказваецца неабходная медыцынская дапамога. Жыхары пасёлка АЭС і з бліжэйшых населеных пунктаў эвакуіраваны.

За станам радыяцыйнай абстаноўкі на ЧАЭС і навакольнай мясцовасці вядзецца бесперапыннае назіранне.

У выніку прынятых мер за суткі, якія прайшлі, выдзяленне радыеактыўных рэчываў зменшылася, узроўні радыяцыі ў раёне АЭС і пасёлку знізіліся.

ВЫМЯРЭННІ, ЯКІЯ ПРАВОДЗЯЦЦА СПЕЦЫЯЛІСТАМІ З ДАПАМОГАЙ КАНТРОЛЬНАЙ АПАРАТУРЫ, СВЕДЧАЦЬ АБ ТЫМ, ШТО ЛАНЦУГОВАЯ РЭАКЦЫЯ ДЗЯЛЕННЯ ЯДЗЕРНАГА ПАЛІВА БОЛЕЙ НЕ АДБЫВАЕЦЦА.

НЕКАТОРЫЯ АГЕНЦТВЫ НА ЗАХАДЗЕ РАСПАЎСЮДЖВАЮЦЬ ЧУТКІ ПРА ТОЕ, ШТО БЫЦЦАМ БЫ Ў ЧАС АВАРЫІ НА ЧАЭС ЗАГІНУЛІ ТЫСЯЧЫ ЛЮДЗЕЙ. ФАКТЫЧНА ЗАГІНУЛІ ДВА ЧАЛАВЕКІ, ШПІТАЛІЗАВАНА ЎСЯГО 197, З ІХ 49 ПАКІНУЛІ ШПІТАЛЬ ПАСЛЯ АБСЛЕДВАННЯ.

РАБОТА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, КАЛГАСАЎ, САЎГАСАЎ І ЎСТАНОЎ ІДЗЕ НАРМАЛЬНА.

Дзе былі дазіметрысты?

Красавік 1991 года. «Набат».

Масквіч К. М. Андрыянаў ужо многа гадзін у поце чала працаваў над аказаннем дапамогі першым ахвярам Чарнобыля, калі эфір разнёс, нарэшце, запозненае афіцыйнае паведамленне аб бядзе, якая здарылася. Вось што аб гэтым расказаў Канстанцін Мікалаевіч, які займаў у той час пасаду начальніка аддзела дазіметрычнага кантролю Інстытута біяфізікі Міністэрства аховы здароўя СССР, нашаму спецыяльнаму карэспандэнту М. СТЭЛЬМАКУ:

— 27 красавіка апоўдні да нас прыбыла першая партыя пацярпеўшых. Дваццаць сем чалавек. Іх прывезлі на аўтобусах і дзвюх машынах хуткай дапамогі — аператар АЭС Дзегцярэнка і пажарнік Кургуз знаходзіліся ў нерухомым стане. Гэта партыя складалася ў асноўным з пажарнікаў. Быў у іх ліку і сяржант Цішура. Чаму я яго добра памятаю? Ён адкрыў сумны спіс памёршых тут... Здарылася гэта крыху пазней, 10 мая. А ў той жа дзень, 27 красавіка, з Чарнобыля ад Г. Д. Селядоўкіна, які ўзначаліў трывожную брыгаду медыкаў нашага інстытута на месцы аварыі, паступіла паведамленне аб адпраўцы ў Маскву другой партыі. Прычым, значна большай.

І сапраўды, вечарам прыляцеў самалёт са 108 пацярпеўшымі на борце. Гэтую партыю прымаў і апрацоўваў я асабіста (першую — дазіметрыст Мікалай Міхайлавіч Ялманаў, які памёр некалькі месяцаў назад). Памятаю да дробязей усё, што адбывалася ў той вечар.

У вочы кінуўся знешні выгляд прыляцеўшых: частка з іх ужо знаходзілася ў бальнічным адзенні, другая — ва ўласным, ды яшчэ з сумкамі, чамаданамі, рукзакамі. Аказалася, гэта былі пераважна камандзіраваныя на будаўніцтва трэцяй чаргі (5-га і 6-га блокаў) Чарнобыльскай АЭС. Як толькі ўзварваўся чацвёрты блок, іх першымі кінулі на расчыстку завалаў.

Многія знаходзіліся ў дзіўнай эйфарыі: усміхаліся, жартавалі адзін з адным. Мяне рассмяшыла, што некаторыя ўзялі ў Маскву бутэрброды, мінеральную воду, нават трохлітровыя банкі з малаком. Маўляў, малако добра дапамагае ад радыяцыі, і родныя забяспечылі іх на дарогу.

Як снег на галаву, звалілася на мяне і прымаўшых медыкаў такая праблема. Спецпрыёмнік 6-й бальніцы быў у той час разлічаны на паступленне 6—8, самае большае — 10 чалавек. Напрыклад, мелася толькі адна ванна. Абпрамененыя работнікі атамных аб'ектаў паступалі сюды час ад часу і раней. Але не ў такой колькасці.

Ва ўсіх без выключэння назіраўся бэта-хабітус: чырвоная скура, у тым ліку на тварах, ад пярвічных апёкаў радыяцыяй. Потым гэтыя апёкі для некаторых аказаліся смяротнымі.

Пацярпеўшыя прадстаўлялі будаўнікоў, энергетыкаў, супрацоўнікаў аховы АЭС, пажарнікаў, аператараў і г. д. Розныя абставіны сыгралі для іх ракавую ролю. Напрыклад, урач і вадзіцель хуткай, якія на месцы прымалі актыўны ўдзел у дапамозе самым першым ахвярам і разам з імі падвяргаліся моцнаму абпраменьванню, наўрад ці маглі пазбегнуць іншага ўдзелу. Аднак у ліку прыбыўшых у Маскву былі і такія, каго падвяла звычайная бесклапотнасць.

У бальніцы расказвалі, што супрацоўнікі аховы выскачылі пад адкрытае неба і давай дзівіцца непаўторным па прыгажосці начным зарывам. Красамоўны факт, які сведчыць аб стане тэхнічнай бяспекі на атамным аб'екце!

Сярод чарнобыльскіх пацыентаў маскоўскай бальніцы аказаўся... усяго толькі адзін прафесійны дазіметрыст. Тады гэта проста шакіравала мяне. Хто такі дазіметрыст? Разведчык, у прафесійны абавязак якога ўваходзіць вызначэнне радыяцыйнай сітуацыі. Якой бы тая ні была, яго рабочае месца на перадавой.

Чаму сярод пацярпеўшага персаналу Чарнобыльскай АЭС аказаўся адзін дазіметрыст? На гэта пытанне я, праз пяць гадоў пасля аварыі, не ведаю адказу. Куды падзеліся астатнія дазіметрысты, якіх адпаведная служба станцыі налічвае некалькі дзесяткаў? Першымі збеглі, забыўшы пра прафесійны абавязак? А магчыма там такой службы не было? Або яны ведалі, што адбываецца, і як выратавацца,— і выратаваліся?

28 красавіка і ў наступныя дні ў бальніцу сталі паступаць новыя партыі пацярпеўшых. Усяго было шпіталізавана 299 чалавек, 28 з якіх памерлі ўжо ў тым нядобрай памяці 1986 годзе.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 5 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

25 красавіка

Зак. 2062.

Т. 1000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.